Асобны № каштуя усюды 50 кап.

Працоуны народ усіх краеу—злуйчася!

ДЗЯННІЦА

Вестка Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту і Масковскай Беларускай Сэкцыі Р. К. П. бальшэвікоу.

КОШТ ГАЗЭТЫ.		
	У РАСЕІ.	ЗА ГРАНІЦУ.
1 м.	1 р. 80 к.	3 р — к.
2 м.	3 р. — к.	4 р — к.
3 м.	4 р. 25 к.	6 р. — к.
4 м.	6 р. — к.	8 р. 70 к.
6 м.	8 р. 50 к.	12 р — к.
9 м.	13 р. 50 к.	18 р. — к.
12 м.	17 р. — к.	20 р. — к.

Перамена адрысу 50 к.

Выпісваючым некулькі экз.—робіцца скідка 20%.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Гранатны пар., 24 Тел. 2-93-77.

Рукапісы, якія прысылаюцца у радакцыю ля друку, павінны быць напісаны разборна і на адным боку паперы.

Ня прынятыя рукапісы ля друку звяртаюцца аутарам назад, калі ля пярасылкі іх прыслана марка, як не-та зніштажаюцца. Радакцыя пакідая сабе правы папрауляць рукапісы.

Радакцыя адчыняна ад 11 да 4 г. У гэты часы прымая і радактар.

№ 42.

Масква, 1918 г. 17 Дзякабра. Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. І-й год выданьня

Канцылярыя Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

ОЧЕРЕДНЫЕ ЗАСЕДАНИЯ

Комитета Московской Белорусской Секции Российской Коммунистической Партии (большевиков)

установлены еженедельно по субботам, в 6 часов вечера.

В помещении Издательского Отдела Белорусского Национального Комиссариата (Гранатный пер., 24) производится прием членов белоруссов-коммунистов в Московскую Белорусскую Секцию Р. К. П. (большевиков).

ИЗВЕЩЕНИЕ:

Редакция „Известий Белорусск. Национального Комиссариата

„ДЗЯННІЦА"

переехала в новое помещение по Гранатному пер., д. 24.

Всю корреспонденцию и переписку просим направлять по новому адресу.

1 января 1919 г. адбудзяцца у Маскве, у памешканні Белнакома (Гранатны, 24) канфірэнцыя радактарау і супрацоунікау усіх выданьняу **Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.**

Заведуючы Выдавецкім атдзелам Белнакома.

Чародныя агульныя сходбішча Маскоускай Беларускай Сэкціі Р. К. П. (бальшавікау) адбываюцца што тыдзень у нядзелю а 11 гадзіня раніцы у памяшканні Белнакома (Гранатны, 24). На сходбішчы запрашаюцца усе т.т. беларусы-камуністы і спагадаючыя ім.

У тыя зьядзель, калі робяцца мітынгі, члены Белар. Сэкцыі павінны прыходзіць усе на мітынгі.

Камітэт Бел. Сэкцыі Камуністау.

Нужны лица, могущие преподавать в школах 2-ой ступени в уездах Могилевской губернии. Желающих просят зарегистрироваться в Культурно-Просветительном Отделе Белорусского Национального Комиссариата (Малая Никитская, Гранатный пер., д. № 24).

ПРЕДУПРЕЖДЕНИЕ.

В виду того, что под именем белорусских-коммунистов в последнее время стараются проникнуть в оккупированную Беларусь и на фронты в качестве агитаторов лица, ничего общего не имеющие с Белорусскими Секциями Р. К. П. (большевиковъ), Комитет Московской Белорусской Секции Р. К. П. (большевиков) заявляет, что он ничего общего с подобными лицами не имеет и просит все партийные и государственные учреждения всегда обращать внимание на пред'являемые ими документы.

Посылаемые Московской Белорусской Секцией Р. К. П. (большевиков) тов. для работы в оккупированных местах и на фронты проходят через Ц. К. Партии и снабжены удостоверениями на бланках с печатью Московской Белорусской секции Р. К. П. (большевиков).

Московский Комитет Белорусской Секции Р. К. П.

20 декабря с. г. в г. Москве, в помещении Белорусского Национального Комиссариата (Гранатный 24,) состоится конференция представителей Белорусских Секций Р. К. П. (большевиков).

Порядок представительства на конференции следующий: секции и ячейки с числом членов от 5 до 10—посылают 1 представителя, от 10 до 20—2-х, от 20 до 50—3-х, от 50 до 75—4-х, от 75 до 100 и свыше 5 представителей.

Московский Комитет Белорусской Секции Р. К. П.

Белорусским Отделом при Комиссариате по делам Национальностей Союза Коммун Северной Области **с 20 октября** с. г. открыта в г. **Петрограде Белорусская Школа первой и второй ступени (гимназия).** В школу принимаются дети всех белоруссов, постоянно или временно проживающих в Петрограде и его окрестностях; и вообще все желающие.

Прием и запись учащихся продолжится до половины января 1919 года.

Школа помещается: **на Проспекте 25-го октября (бывший Невский), дом 68, кв. 9.**

Подробные справки—в Канцелярии Школы.

Масква, 17 дзякабра.

Прачнецяся.

Беларусь становіцца вольнаю. Яе віоскі, сіола, гарады адзін за другім пакідаюцца немцамі і займаюцца расейскімі радавымі войскамі. Тая чорная хмара, якая навісла над Беларусьсю траха ня год таму назад, пачала сыходзіць і са усходу паказалася сонца свабоды і злукі з расейскімі рава- [illegible] працоуным народам ляжыць доугая сьцежка, па якой іон павінен пайсці, каб агледзяць сваю гаспадарку, направіць яе, умацаваць і наладзіць у стасунку з новымі патрэбамі сваго уласнаго жыцьця. Беларус цяпер мае магчымасць і вялікае шчасьця сам кіраваць сабою, сам будаваць сваю будучыну і долю. Радавы устрой даруя яму усе правы, кліча яго да самадзейнасці, памагая яму дастаць сабе волю, землю і працу. *Скарыстайжа, беларусе сваю чалавечая права: ты першы раз у сваей гісторыі стаповіся чалавекам; раней цябе лічылі толькі працоунаю скацінаю і егдзілі на табе.*

У глушыні далёкіх віосак між лясоу і балотау беларус ня бачыу і ня ведау нікога, апрыч сваіх суседзяу. Яго погляд абмяжоувауся тым полям, лесам ці сенажацьцю, між якіх іон узгадаувауся. У гэтуй цемры іон зжыуся са сваім горам, убогасцю, якія зьнішчвалі яго дух і прыпынялі шырокая развіцьця душы. І векамі укаранілася у беларуся нясьмеласць і нягоднасць да самадзеі. Цяпер жыцьцё патрабуя быць моцным, адважным, магучым усіо рабіць бяз чужое падмогі. Дзеля гэтага павінпасцю кожнага шчырага сацыялiста, кожнага, хто дбая аб долі роднага народу, з'уляяцца перш усяго праца над належным асьвячэньням мэтау і дамаганьняу працоунага селянства і пралятарыяту у самых глухіх кутков многапакутнае бацькаушчыны. Гэтую павіннасць дауно ужо зразумелі усе тыя беларусы, якія прыхіліліся да сацыяльнае Расейскае равалюцыі і шмат працавалі над ае пашырэньням. Праца іх па большасці была у Расеі, бо палітычныя варункі перашкаджалі іой на роднуй замлі Цяпер жа, як нямецкі бізун павіс бязсільня, яны маюць магчымасць атдаць сабе роднаму народу, *і сваю павіннасць яны споуняць.*

Цяпер наша слова да тых, хто с часау нямецкае акупацыі застауся на Беларусі і вольна ці бязвольна прымушаны быу маучаць. Мы звяртаемся к ім с зовам да працы па узбудоулі усяго, чаго дамагалася расейская равалюцыя. клічам іх праз тоя, што, мабуць, нашых сілау ня хопіць на усю тую работу, якая чакая нас. Спадзяваемся, што наш зоу да мейсцовых актыуных людзей ня застанецца бяз атказу, бо часы прыгону і усціпна скончваюцца. Мы звяртаемся с зовам і да нашае мейсцовае працоунае інтэлігенцыі—настаунікау, дахтароу, чугунковых служачых, працоунікау пошты і інш,—якая вышла з працоунага народу, скінуць сваю санлівасць, баздзейнасць і далучыцца да нас у агульнум дамаганьні вольнасці народу і барацьбе са усемі яго ворагамі. Ня хочацца верыць тым, хто, вярнуушыся з Беларусі, павядамляя, што інтэлігенція там сьпіць, як і коліcь, што карты, напойкі (балазе немцы нацягнулі спірту і каньяку), так сама як і раней больш усяго займаюць яе. І гэта у тыя часы, як панства пражэцца ізноу зацьвярдзіць сваі валадарства над селянінам ак польскія ксяндзы і расейскія папы ізноу [illegible] над сваю апеку школу, як увесь сьвет напружаецца у барацьбе між абаронцамі вольнасці народау і рэакцыянерамі! Ня наверыш, што сын убогага беларускага селяніна, стаушы інтэлігентам, будзя нядбайным к долі сваіх бацькоу і братоу! Але калі гэта праўда?

Нехай жа яна станя няпраудаю, нехай кожны настаунік, паштавік, землямер даложыць сваю працу да прасьветы сярод народу ідэалау са ыяльнае равалюцыі, нехай увойдзя у камуністычныя арганізацыі і паможа селянству у яго устрою новаго жыцьця. С гэтага часу адчыняецца можнасць бязпрыпынная працы, і на кожнум сьвядомум чалавеку будзя ляжаць пляма, калі іон адхіліць ад сябе павіннасць работы на карысць роднага краю.

Прачнецяся ж усе, сыны працоунага народу Беларусі, скіньця з сабе тую летаргію, у якой вы знайходзіліся пад царскім самадзержау'ям і нямецкім юнкярам, і вольнымі у вольнум краю несеця сваведаньня, сваю годнасць да культурнае і арганізацыйнае працы сваім вясковым братом. *Тады вы будзяця на вышыні сваіго чалавечага званьня, тады выпауніця сваю павіннасць перад народам, равалюцыяй і гісторыяй. Калі ж вы застанецеся у баку, то будзяця чужакамі дзеля сваіх братоу па крыві, і гісторыя выкіня вас і заплямиць, як адступнікау і прадаунцау.*

„Усярасейская Правіцельства".

Пад крылом хаурусных імпэрыялістау у Ясах (у Румыніі) адбываецца канферэнцыя прадстаунікоу розных контарравалюцыйных арганізацыяу і імучых расейскіх клясау. Мэтаю гэтае канферэнцыі з'яуляецца стварэньня такое уласці, якая б «аб'ядпапала» усю Расею. Па вестках с Украіны такоя правіцельства ужо зложана, і Кіеу выбіраецца, як цэнтр, аткуль яно будзя нарыхтоуваць сваю уласьць і навядзе барацьбу супроць «анархічнае» Расеі. Новы „усярасейскі" урад упауламочыу усіх послау пры хаурусных правіцельствах, тых, якія там былі ад Керенскаго, абаранянь і прадстауляць інтарэсы усяе Расеі. Далей, пры надмозя і праз армію Дэнікіна гэтая правіцельства рахуя злучыцца з Уфімскім правіцельствам і дагаварыцца з ім аб канечнум устрою уласьці. Дэнікін за гэта будзя назначаны глаунакамандуючым агульна расейскаю арміяй. Словам, планы самыя шырокія, і спадзевак у іх самы размашысты.

Новая, так званая усярасейская правіцельства, зложана са старых палітычных дзеячоу Мікалаяушчыны, Львовічаны і часткаю часау Керенскаго. У гэтае правіцельства, як сорамна і нясьмела павядамляюць весткі, будуць дапушчаны і някаторыя сацыялісты, мусі-быць тыпу Аукеэнцьева. Але усіо-ж такі увесь склад яго будзя чыста буржуазным, у якім першую скрыпку будзя іграць Мілюкоу, які ужо ад'еxджая у Парыж і Лондан за па аду. Каб мець разуменьня, наколькі гэты урад контар-равалюцыйны, трэба успомніць, што нават украінскія нацыянал-сацыялісты пятлюраускаго толку ня дапусціліся на нараду у Ясы, у тыя часы, як гетман Скарападскі корыстаецца шчырым падтрыманьням і прызнаньням з боку гэтага ураду. А гэта той гэтман, па прыказу якога разганяліся пэхаувыя хаурусы рабочых, растрэльваліся усе прыхільнікі радавае уласьці і дзеячы сацыяльнага пераваропу на Украіне і адбіраліся у селян і варочаліся паном землі. Такія асобы, як Скарападскі, патта прыемны дзеля хаурусных імпэрыялістау. [illegible] яны, як напрыклад адмірал Колчак у [illegible] грашавыя пазычкі, зробленыя царскім урадам. Каб варнуць гэтыя грошы і трэба скасаваць Радавую уласьць, аб'еднаць Расею пад адно валадарства буржуазнага ураду і вярнуць панству атобраную у яго землю, а прамысловікам іх хвабрыкі і заводы. Такоя аб'еднаньня карысна і хаурусн кам і нашуй расейскуй буржуазіі.

Расейская радавая правіцельства так сама дамагаецца аб'еднаць Расею, але аб'еднаць усех бедных, усех рабочых і селян, злучыушы іх у едзіную працоуную сем'ю. Мэтаю гэтаго аб'еднаньня з'яуляецца заахова правоу працоунага клясу, пашырэньня сацыялізму і скасаваньня валадарства багацеяу. І гэтая аб'еднаньня мая за сабою вялікую сілу ня толькі у народных аграмадах Расеі, але і у равалюцыйнум пралятарыяту усіх земель. Вось, за „усярасейскім урадам" хавается цыпламація хаурусьнікау, і гэты урад пражэцца к абураньню сацыяльнае равалюцыі і рэакцыі; з боку ж Радавае уласьці стаць увесь народ ня толькі Расеі, але і іншых земель Эуропы і усяго сьвету, які хоча сам кіраваць сабою і вызваліцца з-пад прыгону буржуазіі. С аднаго боку хітрыкі, прадажнасць і ашука старых палітычных махляроу, з другога—дзейная народная сіла і належная праца. Разуменьня таго, што рэальная сіла за намі, што на нашуй старане права, перахоуная права працоунага народу, і дая нам магчымасць цвёрдае надзеі на тое, што мы, прыхільнікі і тварцы работніцка-селянскай уласці аб'еднаем усю Расею—і ня толькі яе адну,—а ня тыя прыхвасткова і наумысьля зложаныя „усярасейскія урады", якія з'яуляюцца гатункам англа-францускае дыпламатычнае кухні.

Н. Ц.

Гапон'я і Сібір.

Побач с пагрозаю усясьветнуй равалюцыі пагрозаю якая ідзе с заходу ад Паупочна-Амерыканскіх Злучаных Штатау, галава якіх—Вілсон дамагаецца зрабіцца жандарам і дыктаваць сваю волю эурапэйскім народам, другая пагроза ідзе са усходу з боку імпэрыялістычнае Гапоніі. Карыстаючыся усясьветнуй у Эуропе пажарам вайны і аслабленьням ваеннае моцы праз равалюцыю аб'[illegible] гэтыя дзяржавы, менш усяго пацярпеушыя ад вайны, ня толькі нарэшце адчапіцца ад залежнасці у эканамічных і палітычных справах ад Эуропы, але нават і атрымаць кіраунічаю роль [illegible] усясьветнуй палітыцы імпэрыялізму. [illegible]

…гэтум напрамку сваіх дамаганьняу гапонскія імпэрыялісты зайшлі так далёка, што з вялікаю завіднасцю пачалі глядзець на тоя, як пашыраяцца і паваліачваяцца палітычная значнасць і вага Амэрыкі. Гэтая завіднасць і давяла да думкі і жаданьня хаурусу між Гапон'яй і Гэрма'яй падзелам Расеі на „сферы вліян'я" да поупае вазстановы манархічнаго устрою у апошняй. Толькі равалюцыя у Гэрмані перашкодзіла гэтаму хаурусу

Але тым ня менш, Гапон'я ня кінула думкі аб захапляньні расейскіх земель. Па апошнім весткам з Сібіру гапонскія вайскі займаюць усю Забайкалья на усход да Уладзівастоку; яны трымаюць усю чугунку ад ст. Мысовая на Байкаля да Уладзівастоку, а так сама і Усходня Кітайскую жалезную дарогу. Разам з гэтым гапонская буржуазія і грашаунікі з пэнтам скупляюць рожныя хвабрыкі, заводы, гандлёвыя прадпрыімства і прамысловыя установы у Чыце, Нерчынску, Верхнеудзінску і іншых драбнейшых гарадох. Пакуль што будзя с вазстановаю манархіі, рахуюць гапонскія імпэрыялісты, а трэба стаць цьвёрдаю нагою у Сібіру. У сваіх захопных дамаганьнях яны ня толькі ня сустракаюць спрэчкі, але нават поуная падрыманьня з боку «Сібірскаго правіцяльства», якоя прабуецца утлумачыць, што Гапонія і ня думая захапляць расейскія землі. Вядома, на чыіом возя сяджу, таму песню пяю. Сібірскі урад, трымаючыся толькі пры падмозя Гапоні, стараецца падпіваць ёй і разам з ёю прыгнятаць вольная сібірская селянства і рабочых. Дзеля гэтае мэты ён ужо і ня шкадуя і ня спрачаяцца таму, што народная маетнасць на крысе пераходзіць у рукі іназемных абірайцау. Але нехай помняць здраднікі, што адплата за гублю народнага дабра будзя стращнаю, як толькі усясветная равалюцыя дабярэцца у тайгу і горы Забайкал'я.

Немански.

І хочацца і коляцца.

Пытаньня аб агульнум замірэньні ня выходзіць з лістоу газэт усіх напрамкау ва усіх землях. Гэрманскія газэты знаходзяць, што варункі замірэньня патта цяжкія і могуць пры выпауненьні іх зусім загубіць Гэрманію. Нямецкі друк не бяз справядлівасці бачыць у такіх варунках пражэньня хаурусьнікау расшматаць Гэрманію на асаблівыя кавалкі, каб хаурусіоды вызваліцца ад пагрозы з боку апошняе. Гэтая падмацоуваяцца варожымі адносінамі хаурусных палітыкау к аб'яднаньню з Гэрманіяй нямецкае Аустрыі. Хаурусная ж газэтная пісьменасць і хаурусныя палітыкі трэбуюць расправы з Гэрманіяй: па іхняму Гэрманія павінна выплаціць усе ваенныя патраты, адцурацца ад сваіх правоу на колішнія калоніі. Караблі, цягнікі, вагоны перадаюцца хаурусьнікам, блакада застаецца і па далей, хаурусныя вайскі рушацца у глыб Гэрманіі, і вышэйшая камандаваньня хаурусьнікау мяніцца забраць самы Бэрлін. Сацыяльная прэсса у хаурусьнікау задушана патрыятычным гукам і ня можа вывесці свайго шчырага голасу. Але сацыяльны рух ідзе, і аб гэтым сьвятчыць трывога у англіцкіх буржуазна-кіруючых гуртках, якія прымушаны былі сазнацца, што народ ня зможа вытрываць, чакаючы, тры месяцы замірэньня. Гэты тэрмін у тры месяцы назначаны амэрыканскімі грашаунікамі, якія пад'юджваюць сваіх англіцкіх сяброу навясці у Эропя сперша належачы парадак, а потым ужо заміріцца. Погляд хаурусных палітыкау знайшоу свой адгук у рэчы Нуланса у Архангельску, які заявіу, што пасля немцау хаурусьнікі займуць акупаваныя мейсца у Расеі, а так сама і у славах Ллойд-Джорджа, які аб замірэньні трымаецца такое думкі, што яно магчыма толькі тады, як у Гэрмані зложыцца урад, выяуляючы волю большасці нямецкаго народу (ці калі там ня будзя радау?). Дзеля навядзеньня «парадку» у Эуропя патрэбуецца натта шмат часу, так што «сам» Вільсон рахуя падпісаць рахунковую згоду толькі у апрэлю месяцу 1919 году. Вось у хауруснае буржуазіі дзве думкі, дзве апаскі. Першая — ня упусціць дабра з сваіх рук, якоя ліохка плыве да іх; другая — змагацца з равалюцыйным рухам, які будзя пашырацца у іх с працягам вайны. І хочацца нажыцца, як мага больш, і боязно, што можна апаліць рукі, наткнуцца на піку і патраціць тоя, што маяцца у іх цяпер. Праз гэта і тыя праціуныя весткі, якія сустракаюцца у газэтных павядамленьнях аб замірэньні: там пішуць, што канферэнцыя збіраяцца у палове дзекабра, тут павядамляюць, што у феуралі і г. д.

З нашаго ж погляду здаецца, што агульная замірэньня залежыць ня ад волі і жаданьняу буржуазных дыпламатау, але ад ходу равалюцыі. Чым шырэй яна захопіць крух зямель і народау, тым хуччэй будзя замірэньня, бо равалюцыя зьмяце тых, хто пражэцца закладаць палітычныя камбінацыі гасударствау дзеля зняваленьня працоунага народу. Гэтыя камбінацыі ужо робяцца. Так, Сесіль (той самы, што паграджау у палаця вобшчын скасаваць работніча — селянскую уласць у Расеі) назначаны прэзасам англіцкае сэкцыі лігі (хаурусу) народау на усясьветнуй канферэнцыі. Гэты «хаурус народау» і будзя дамагацца згуртаваць сілу супроць самых жа народау у іх равалюцыйнум руху.

Калі складаяцца такі «хаурус народау», та вайна хутка ня можа скончыцца, і яна кончыцца ня так, як мяркуя буржуазія. Спачатку хаурусныя імпэрыялісты пашлюць свае вайскі падауляць равалюцыю, і у гэтуй вайне родзіцца англіцкая і французкая равалюцыя. І толькі пасля клясавае вайны там, як будуць скінуты буржуазныя урады, настаня вечная згода і хаурус вольных народау — хаурус працоунікау усіх зямель.

І. Р.

* * *

Свішча вецяр панадворку
Дрэуцы голыя гайдая.
Сына роднаго — Рыгорку
Маці з хлебам сустрачая.
Слезы бойныя па твару
Як гарошыны спадаюць,
Думак чорных, цяжкіх хмару
Спадам вагкім прабіваюць.
Доуга — доуга — пяць гадочкау,
Як сынок яе быу дома;
Многа у родняньнкім куточку
Стала чужа й незнакома.
Быу пажар — згарэла хатка;
Бацька умер яшчэ здаровы,
Многа згінула дастатку,
Ветрам дуб зламан вяковы.
Паглядзі, мой сын, вакола,
Палюбуйся — што страчаяш
Усе ж ня туж, а будзь вясёлы
У пяць год дом ты нявашчаяш
І аднэю хлеб рукою
К сэрцу матка прытуліушы,
Стала сына ужо другою
Абнімаць перахрысціушы.
Сын схіліуся, тая гора,
Што праведау ен ат мала
У сэрцу змучаным Рыгора
Віхрам дзікім узбушавала
Над вачыма звісла тулям
Смуць успаміну — одгук ясны —
«Ці ты ведаяш, матуля,
Як я рады, як я шчасны.
Многа, многа, хая маці,
Мук цярпець мне давялося
У муках родных успамінаці
Усе, што дома асталося.
Я ня думау, ня меу веры,
Што удасца мне сустрэцца,
Што увайду я у свае дзьверы
Й маці шчэ мне усміхнецца
Як забралі, як пагналі
Думау я, што марна згіну —
Усе надзеі прападалі
Аб каханую краіну.
І як сонца прасіяла,
Як маланка праблісьнула,
Матка родная спаткала,
Матка к сэрцу прыгарнула.
Як шчасліу я, як я рады,
Слоу казаць мне не хапая.
Лепшай больш німа награды
Жыцьце ей нідзе ня мая».
Матка плача: «Мой Рыгорка —
Мая радасць, мае сэрца»...
Свішча вецяр па надворку
Калыхая у саду дрэуца.

Цішка Гартны.

Беларуская сэкцыя Расейскай Камуніст'кай партыі.

24-го лістападу адбыуся першы агульны сход Маскоускае Беларускае сэкцыі Р. К. П. (бальшавікоу). Сэкцыя ужо ахвіцыяльна зацьверджана і ня гледзячы на тоя, што далека ня усе таварышы беларусы — камуністы былі паведамляны, за малым часам, сход сабрау некулька дзесяткау чалавек. Нельга ні падкрэсліць, што атказны ля нас, беларусау, момэнт захапіу усіх і прамовы усіх гаварыушых таварышау ня мелі лішніх слоу, былі поуны энергіі і веры у свае сілы. Сход працягся некулька часоу, але прамовы усіх былі заслуханы з ніаслабнаю уніклясьцю, як ні стаміліся усе ад бязперарыунаго пасядзэння. Каму даводзілася быць на рожных іншых беларускіх палітычных сходах — таго дух камуніст'каго сходу мог вельмі здзівіць. Чулася моц.

Па прапанаванні аднаго з таварышау сход успомніу памяць тав. Хрэнава, памершаго на гэтых днях ад гішпанкі. Зацьвярдзіушы новых сваіх членау і заслухаушы даклад Арганізацыйнаго Бюро аб усей рабоця па заснаванні Сэкцыі, сход перайшоу да важнейшаго пытання павесткі дню — стварэнню тае камуністкая сілы з беларусоу, якая павінна узяць на сябе усю цяжар працы мамэнту, каб вырваць беларускі народ з кіпцяу міжнароднаго імпэрыялізму з рук сваей краевай буржуазеі. Беларускія камуністы, па поглядам усіх прамоуцау, павінны як мага хутчэй згуртаваць свае сілы і кінуць іх на барацьбу з тымі ліхімі варагамі беларускае працоунае масы, якія назбіраліся і каля Рады „нязалежнае" распублікі, і каля эсэраускабундаускаго цэнтру (губэрскаго земства), і каля застаткау наймітау польскіх панау, легіанерау, і каля рожных контаррэвалюцыонна — ахвіцэрскіх бюро, займаушыхся вербоукаю людзей у пауночную і паудзенную арміі. Трэба разам с тым карыстаць момэнт, калі неспадзеваны націск чырвонае радавае арміі захапіу нягатовымі яшчэ усіх гэтых чорных крукоу рускае рэвалюцыі.

Буржуазные элямэнты Беларусі, гуртуючыяся каля Мінскае Рады, кінуліся цяпер шукаць помачы у Бэрліне, Кіяве Варшаве і Вільні, увайшлі у звязак з дзержавамі Сагласу (Антанты), але нішто не спасе іх ад гневу народнаго. Разам с тым польскія імпэріалісты (эндэкаускаго гатунку) паспешаюцца захапіць Гродзеншчыну (як Беласток, Гродну, Ліду), каб ня упусціць момэнту: ужо к Баранавічам падыходзяць з захаду гэтыя легіаперы.. Беларусь кіпіць як гарачы кацел... Рэвалюцыйная селянства, [illegible] ідучы за Радаю, за земскім цэнтрам, [illegible] згуртаваліся сацыялісты — згодн[illegible] стаушыся бяз павадыроу, мест[illegible] пялось абязбройваньня нямецкіх акупантау, нягледзячы на іх нібыта — рэвалюцыйнасць, часамі проста перабівая іх, рэжа панау па маентках. Лічачыся з атказнасцю момэнта, сход аднагалосна прызнау патрэбу склікаць як найхутчэй агульны з'езд прэдстаунікау усіх беларускіх, камуніст'кіх арганізацый, як істнуючых у радавай Расеі, так і у акупованай Беларусі, каб выдзеліць той кіруючы камуніст'каю працаю на Беларусі цэнтр, які так цяпер патрэбян краю.

Падгатоука з'езду даручэна Камітэту Сэкцыі, для нарыхтавання ж адносін і звязку з друлімі ужэ істнуючымі беларускімі сэкцыямі у Пецярбурху, Тамбовя, Саратавя выдзеляны тры асобных дэлягацыі, па атрыманні вестак ад якіх аб змове з гэтымі пунктамі будзя вырашэн і дзень і места з'езду.

Другім паважным пытанням сходу Сэкцыі было становішча Белнакома. Атказныя працоунікі яго досыць фактычна абрысавалі усе варункі працы, у якіх нес сваю працу Белнаком. Сэкцыя змушэна была прызнаць, што праца камісарыяту ішла у натта цяжкіх варунках, якім ня можа быць места у радавай рэспубліцэ.

Разам с тым сход лічыу патрэбным узяць Белнаком пад агульнае кірауніцтва і кантроль, каб пашырыць яго працу як гэтаго вымагая атказны перад русскаю і сусветнаю рэвалюцыяю момент.

Бяз галасоу проціу Сэкцыя прышла да пастановы, што патрэбна прапагандыст'кая штодзенная газэта, якая б несла у массы камуніст'кія ідэі і вела б напрамак погляду працоунаго гаротніка Беларусі. З-за тэхнічных прычын дачасу павінна быць выкарыстана „Дзянніца", дзеля чаго патрэбна яе выпушчаць часцей, а з выхадам чыста партыйнае беларускае газэты у „Дзянніцы", як ахвіцыяльнум воргане камісарыяту, друкаваць апрыч ахвіцыяльнаго матэр'ялу яшчэ чыста дзелавыя атчоты і артыкулы і кроніку будоулі новаго жыцця. Пастаноулена яшчэ выдаваць патрэбную камуніст'кую літэратуру.

Прыдаючы вялікую вагу пастаяннаму звязку партыйных працаунікоу на рожных абавязках, ля творчае працы самых масау, захопляных камуніст'кім рухам, [illegible] вацьяк скарэй гэтую справу.

Пасля галоунейшых пытанняу павесткі сход заняуся выбарамі: быу выбран Камітэт Сэкцыі з 9 чалавек і 3 к ім кандыдатау; выбраны прэдстаунікі ад Сэкцыі у Прэснянскі раіонкамітэт партыі у Маскоускі Гарацкі Камітэт Р. К. П. у раіоны — соудэп і сэкрэтарыят Ц. К. партыі.

Сход закончыу сваю працу прынцыпіяльнаю пастановаю' што Сэкцыя лічыць патрэбным, як найскарэй і як у найбольшум ліку працаунікоу, паслаць сіл на Беларусь дзеля агітацыі і радаваго будауніцтва.

1-го снежня адбыуся новы сход Сэкцыі. Пасля прыняцця новых членау Агульны Сход заслухау даклад загадчыка культ.—асветнаго аддзелу камісарыяту тав. Турука. Негледзячы па тоя, што т.

Друкуяцца другі беларускі пралятарскі збор твораў

„ЖНІВО",

у якім, між іншымі будуць змешчаны творы: Цішкі Гартнаго, М. Гарэцкаго, Палюбуйся, Я. Петровіча і Х. Чарнушэвіча.

Прымаяцца задатак на высылку збора „ЖНІВО".

З издательском отделе Б. Н. К. вышла новая книга:

Е. С. Канчер.

Классовая, Национальная и Религиозная Борьба в Беларусии.
Часть I. **Цена 1 р. 50 к.**

Штрайбрэхар.

(Канец. Глядзі № 41).

VI.

На заутра з ранку, толькі што Нухрэй прачнууся, да іх прышоу Зміцяр Клін. Нухрэй загледзяу яшчэ яго на вуліцы і усё сьмецііу, што той хіліць да іх; за гэтым і сэрца яго неяк міжвольна с цемнаю трывогаю пачало цюкаць, а у галаве заварушыліся усялякія няпеуныя, дагадлівыя і атрыуныя думкі; яны малявалі спалохныя образы таго, што з ім, Нухрэям, зробяць таварышы, паслаушыя да яго Змітра.

Думка за думкаю мчаліся у яго голау і кідалі у дрыготку пастаяцу. Аднак прыход Змітра вымусіу яго сустрымацца і нагальна сябе супакоіць.

— Відаць ты прышоу за чымсці надзвычайна важным? — стрэу яго чуць ня на парозя Нухрэй, пытаючым поглядам пранізаушы да сэрца Змітра; пры гэтым ен неяк загадна ухмыльнууся.

— Сядай, братко, у нас, — дадау Нухрэй і сам першым сеу на лавя, у рагу стала.

— А чаму ня спроста, ня так сабе,— так сама з ухмылкаю адказау Змітро, садзючыся ля другога рогу стала.

— таму, што ужо дауно вельмі, як заходзіу.

— Ня прыпадала усе.

— Часам ня прыпадала, а часам і ня хацелася,— дадау Нухрэй.

— Было і гэтак,— згадзіуся Змітро:— За тоя цяпер прыпала і ікрас у руку.

— Чаму?

— Меу сюды дарогу за іншым дзелам і па дарозя ікрас ня абмінуу і вас.

— А што, цікауна, братка, у цябе за справы ка мне? — з гострым цікам і з асобным тонам прамовіу Нухрэй.

Змітро неяк ухмыльнууся, паглядзеу у вакно, сплюнуу па прывыцца, уцер губы і завеу:

— А вось што, суеед... Убачай ужо ты мне за нядалікатнасць... Бач тут справы ня мае асабцістыя а... агульныя, нашы агульныя гарбарскія справы...

Нухрэй раптам зблядзеу і міжвольна схамянууся.

— Ведаю ужо, ведаю... скорамоуна перапыніу ен Змітро:—Ці ня на конта учарашняго адно?

Змітро ні то пусціу тварам сьмех, ні то зрабіу здзіуляную міну — так асоба выглядзяу.

— Да няужож што... Гэта ж учора: прыходзіць Наста і... запінаючыся і трасучыся, пярабіу ізноу Нухрэй:

— Я не бачыу, Насту бач, твою. І такі думаю... Нават чакау цябе, братко, калі хочаш ведаць... І да цябе парываутся іці, каб асьвядаміць, каб ты ня падумау, што я усіо таемна раблю, бяз ведама... але неяк.. знау ды усе, што ты сам прыдзяш, нібыта чуу...

— Троха ня пуціова ты...

— Думаяш, братка Змітро, я няведаю сам, што кепска, але... увайдзі у палажэньня... есці німа нічога, дзеці галодныя, самі ня еушы.. Я думау-думау, змагаус сам з сабою і... парашыу папрасіць... Бо што ж, ніхто ня паможа: хаурус грошай ня мая на падмогу, а дастаць так — німа у каго... Думаяш, Змітрок, гэта мне ліогка далося? Ня думай, ховай Божа: трэ было бараніць сем'ю, вымаць з рук смерці, вось я і парашыу..

— Дык лепі ужо ты пазычыу бы у мяне рубліоу кольні.

— Каб я знау! О, каб я знау гэтая, ці ж адказауся б. З вялікаю радасцю узяу бы, ніж у гэта паганьства лесці... Але адкуль мне знаць?.. А я добра ведау, што гэтым раззлую ня толькі цябе, а і усіх хлопцау... Ведау, добра ведау.

— Ну, я та нічога так і ня маю супроць, але... здаецца ужо і другія ведаюць, калі ня усе...

Мне учора вечерам на біржы казау Костусь; стрэу і кажа: Нухрэй за штрайбрэхара стау.

— Ну?!—здзіуляна, увесь скаланууушыся ад страху, ажно падскочыу на мейсту, ня праказау, а прагукау Нухрэй.

Луцэя, увайшоушы на гэты момант з сянец, раптоуна азірнулася на мужа і з мінюту вырачыушыся глядзела на яго.

— Ці можа то быць?! Божа ж мой, я так і ведау, што гэта выйдзя так. На ліха мне, па бяду, на што я наслухау яе.. Уміраць з голаду-умірай, толькі...

Тут ня шукай ні літавосці, ні спагады... Але сям'я, малыя? Што ж яны вінауны?.. Не, цяперака усе скончана, загублена ля мяне. Па праудзя, ці ня — позна разбірацца — Нухрэй падняуся з мейсту, хапіуся рукамі за голау і швыдка прайходжвауся, сапраудняй, тапаціуся па хаця. У вачу яго адбівалася безнадзейнасць і страх, міна выказвала боль.

Змітро ажно няпрыкметна садрыгауся ад пачуцьця спагады да Нухрэя. Тая нязадавольнасць яго, з якою ен прышоу да Нухрэя, і вымагаючая гэтай нязадаволью укора, якую ен думау ужыць на ем, далі мейста спагадзя, зауладаушай ім.

— Нухрэй, Нухрэй! Чаго ты так затрывожыуся! Яшчэ ж нідзе нічога, а ты... Ды ня будзя, бадай, нічога: я уступлюся за цябе... Супакойся, пакінь, цудны ты... Мала што трапляяцца.

— Штрайбрэхар, зменнік!.. Ня супакойвауся Нухрэй... А галодныя дзеці... блядыя, худыя... бяз помачы, бяз капейкі... няужо ня паверацъ? Няужо ня маюць разуменьня і пачуцця?

— А хто разумея? Хлопцы? На усіом здавольсцвя, пры гаспадарсцвя? — ухваткнула свае словы Луцэя.

— Ня разумеюць хлопцы, та я разумею,—адказау Змітро: я жанаты, сямейны, я і разумею... І больш ніхто і ніщто нам ня патрэбян і ня указшчык... Кепска, ня пахвальна, але трэ ачуваць прычыны, абачыць іх ясна... і тады ужо судзіць.

Нухрэй змітравымі славамі на хвілю сцешыуся і прыпыніуся у хацьбе.

— Ну але, ты павінян ачуваць усіо гэта, бо і у цябе есцяка дзеці... Ты уже заступіся, Змітрок, за мяне, прашу я цябе... Я ж сазнаюся, ня таюся... Быу у Лейзара і узяу у яго пятнаццаць рубліоу, а узяу таму, што палажэньня вымушала: дзеці бяз хлеба сядзяць, самі галодныя... Жылі з заработку, а падмогі німа...

— Але, ужо уступіся, Зміцарка... Калі гэтыя бязспагаднікі ужо пачнуць такім манерам, та ты дакажы... Луцэя хацела казаць далей, але Нухрэй нязадавольным махам рукі яе сыпыніў.

— Да я закіну слова, калі трэ будзя,—паднімаючыся з лаукі, уверыу Змітро.—Відома што ня з паклону да жуликау ты зрабіу гэта... Я цяперака сазнаю... Змітро зрабіу некульні крокау к дзьверам.

— Ну, бывайця здаровы! А ты, Нухрэй, ня трывожся ужо.

— Ідзі здарову... Толькі пастой, браток, перад таварышамі... Ад гэтаго многая залежыць...

Змітро кіунуу галавою у знак згоды на прозьбу Нухрэя і пайшоу. Луцэя, усе яшчэ упрашаючы, выйшла за ім у сенцы, а потым і у двор.

Нухрэй жа зразу удауся у думкі і ізноу захадзіу па хаця.

Безнадзейным цугам, нібы у кінатографу, паляцелі перад ім усялякія абразы і малюнкі.

На чорным палатне, сатканым праклятым ужасьнівым і разасланым перад ім, яскрава выплылі хвігуры усіх таварышау-гарбароу, та маякія, добрыя, та злыя, сібергінія і гразныя... Адны баранілі, другія накідаліся і грозілі... За хлопцамі нібы сядзелі, прамігалі дзеткі, Янка і Сцепка, спугныя, дрыжучыя, з заплаканымі вачыма...

Ні сонца, ні прамінные яго у зайчы...

Турук працавау незвычайна энэргічна. Але у культурна—асветнум напрамку дзеяльнасці камісарыяту было так сама бязканца перашкод і прытом такіх, якія незалежылі ад волі працаунікоу атдзелу. Сход быу здаволян энэргіяю тав. Турука і звярнуу толькі увагу на тоя, што ліквідацыйны аддзел Белнакому не стаіць на сваей вышыні. Выходзячы з гэтаго Сэкцыя пастанавіла паставіць іншаго загадчыка аддзелу, што гэтым нарыхтаваць як след працу.

Із іншых пытанняу сходу важнейшым быу яшчэ пасыл патрэбных людзей на Беларусь. Лічачыся с тым, што разам з апрастаннем немцамі тэррыторыі акупавануй Беларусі павінна ісьці адбудова савецкаго (радаваго) ураду, Сэкцыя пастанавіла паслаць ля працы гэтай як мага больш сваіх членау. Таму што шмат з іх аказаліся занятымі іншымі службамі, пастанавілі—зняць іх са службы і усіх паслаць на бацькаушчыну, лічачы што у цяперашні момэнт палітычная праца мая вялікую вагу на утварэння савецкае Беларусі.

Л. Жорсткі.

Як і колісь.

Быу малы я, думау часта,
  Як дадуць мне часу:
«Пачакайця — і на вас я
  Прыпасу атосу!
Дайця толькі акрыяць мне
  У гадкі вабрацца!
А пакуль што усім старэйшым
  Мусіу пакарацца.
Я тым часам падрастаю,
  Аддалі вучыцца.
Нядагодзіш настаунiку —
  І пачне сварыцца!
Але добра, калі сваркай
  Сойдзя заву'руха,
Ды у тым гора, што настаунік
  Часта трос за вуха.
«Ну, настой жа: жыв[illegible]
  А за тыя здзекі
Ня дарую, толькі б вышау
  С пад тваей апекі».
Так намысліш за скамейкай,
  Узяушы вуха у жменю,
І цішком кулак сціскаяш,
  У сунуушы у кішэню,
Ды цярпіш і зносіш крыуду,
  Помсты час жадаяш.
Больш расцеш—у залежнасць—ліха
  Боляй пападаяш.
Вось я вырас, і пад носам
  Вусы высядаюць,
А мяне вакруг усе губяць,
  Клеваюць, ушчуваюць.
Накіпела у сэрдцы гневу,
  Злосьці—поуны косьці!
Ня стрымау я, разгарнууся:
  Я ж вам, ягамосьці!
Пачакайця ж, калі гэтак!
  То ж я ні кусауся.
Годзі здрады! досыць здзеку!
  Узяу... ды узбунтавауся—
Проціу уласьці і парадкау!
  Хіба ж я уломак?
Хай сабе на погляд шчуплы
  І ні так то емак.

Божа наш! ускіпелі уласьці,
  Гоняць у тры шыі.
«Ведай, гад, па чом хунт ліха,
  Помні—ты у Расіі»!
Трэсьлі, трэсьлі, калацілі,
  З жалю хоць разьбіся.
А па рэсьці у крэпасць садзяць —
  Там, моу, схамяніся!
Вось сяджу я за рашоткай,
  Горш мяне ушчуваюць,
З аднэй камэры у другую
  З сеннікам ганяюць.
Я іду, куды мне кажуць,
  — Ды будта сам сціха:
«Пачакайця, адсяджу я
  Перабуду ліха...»
Ценям крыуда йдзе за мною
  Аж да тэй часіны,
Знау кулак у кішэні счэмлен,
  Як і у дні дзяціны...

Якуб Колас.

Аб беларускум клюбя і яго заданнях.

Дзіуны мы народ, беларусы, і трагічна наша доля! У той час, як жыцціо варам кіпіць навокала нас,—мы лядным і ня варухаямся. Народ наш сьпіць у зачарованум сьне, які быу напушчаны на яго сотні гадоу таму назад. Гінулі старыя дзяржавы, складаліся новыя, а іон усіо спау. Нават цяперашні магутны катаклізм, ускалыхнуушы увесь сьвет, ня узбудзіу беларусау. Праула, іосьць у нас цапер і свае «правіцяльства» і свой «парлямэнт», але усіо гэта—толькі дэкорум, толькі відзімасьць. Увесь гармідар робіцца нявялічкім гуртком інтэлігэнтау, а народ застаецца у баку. Іон сьпіць і ня бачыць, што яго бацькаушчыну Беларусь, і так ужо аголяную і спустошаную праз гэтую праклятую вайну, абдзіраюць, абкрадаюць да апошняй нітачкі розныя чужынцы і наездчыкі, цягнуць яе дабро у сваю бярлогу мяйсцовыя хішчнікі. Калі беларус прачнецца,—а гэта пекалі ды будзя,—іоп можа аказацца «голым чалавекам на голуй зямлі». Страшна робіцца за народную будучыню!

Значная часьць народу нашаго разсеяна віхрам вайны па усіх кутках Расейскае Распублікі. Шмат беларусау і у Маскве і пры том такіх, што маглі-б быць надта надатным матар'ялам да абуджэння сярод іх нацыянальнай і кляссавай сьвядомасьці. Але усе яны раскіданы, расцярушаны па Маскве, нічым ня даюць значэння дзеля беларускай справы. А час цяпер адпявядальны, случны час, які бывая, можа, раз на тысячу год. Калі мы й цяпер прасьпімо, дык можам і зусім загінуць. Трэба сабраць свае параскіданыя сілы і у згодзя з іншымі народамі Расейскае Распублікі будаваць новую сьветлую будучыну. Мы сядзімо у Маскве, пазабіваушыся у свае норкі, ня бачучы нікога з сваіх адназемцау, і думка наша бязсільна завядая. Мы нават ня маямо мейсца, гдзе-б мы маглі сабрацца, пагутарыць аб роднуй Беларусі, падзяліцца думкамі аб яе будучыня, паслухаць роднай песьні.

Беларусы—народ з найболяй дамакратычных у сьвеця. Частка нашаго селянства, выгнаннага вайною з роднай хаты, асела на Маскоускіх хвабрыках і перайшла (хоць, можа, і часова) у рады работнічаго клясу... Немяц ужо пакідая Беларусь і хутка зусім з яе выступіць. Селяне кінуць хвабрыкі і пасьпяшаць на свае папялішча, гдзе чакаюць іх старыя крованіуцы-памешчыкі, надта аб-нагле-ушыя за часы нямецкаго панавання. Трэба, каб беларускія селяня варнуліся з выгнання з *ясным клясавым сьветаглядам* і нядаліся закаваць сябе у старыя ланцугі. Вот гдзе іосьць няпачаты край працы ля нова-паустаушай Беларускай Сэкцыі Р. К. П. гор. Масквы! Узварушыць, узбудзіць і далучыць да працы над тварэнням беларускай будучыны гэтую расьцярушаную і інэртную масу.

Як ня жаль, дагэтуль мала рабілася у гэтым напрамку. Цяпер трэба папраулянь абмылку і чым хутчэй,—тым лепш. Трэба зараз-жа адчыніць беларускі клюб. Гэта павіннасьць Беларускай Сэкцыі Р. К. П. і яе найперша задання. Але, каб клюб выпауніу свае, назначэння арганізацыйнаго і агітацыйнаго цэнтру,—іон ня павінян мець *каставаго* характару,—яго трэба адчыніць ня толькі для беларусау—камуністау, але і паагул ля усіх працоуных беларусау Масквы. Чытання аб гісторыі Беларусі, беларускаго нацыянальнаго і рэвалюцыйнаго руху, аб заданнях найблізшаго часу; беларуская песьня і музыка, жывоя беларуская слова, як магнусам, прыцягнуць да яго беларусау. Тут жа можна будзя асьвядомліваць нясьвядомых, тлумачыць ідэі каммунізма і, пашыраючы базы Беларускае Сэкцыі Р. К. П., рабіць яе больш моцнай і працаздольнай.

А на скольні сумуюць беларусы аб сваіой Беларусі, насколько рвуцца да свае песьні і роднаго слова,—можа быць прыкладам 8-е наябра, калі на сьвяткавання гадавін рэвалюцыі, уладжаная Беларускім Камісcарыятам, зышоуся тлум пароду, і у перапоуняную салі панавау проста-такі электрычны настрой. Публіка з прагавітасьцяй згаладаушыхся людзей лавіла родная у кожнуй ноця родных песьняу... Але песьні гэтыя пяяліся чужымі людзьмі, ня выявіушымі іх беларускай стоты, і народ разыходзіуся засмучаны. Але гэты вечар паказау, што тут у Маскве іосьць вялікая і дужа надатная беларуская маса. Гэтаго абмінаць нельга!

Ня ведаю, можа Беларускай Сэкцыяй Р. К. П. і робіцца што-небудзь аб гэтум напрамку, а калі не,—дык хутчэй, браточкі, за працу!

Павал Любецкі

О Белорусском техникуме.

Несмотря на все препятсвия, какия ставились русской бюрократией царского самодержавия на пути развития народного просвещения в Белоруссии, в последние годы, начиная с 1909 г., все-таки там начала быстро развиваться сеть различных учебных заведений, главным образом низших и педагогических дл для подготовки учительского персонала. Толчок к развитию школы на Белоруссии дали в особенности учрежденные в 1911 году земства, благодаря деятельности которых число низших общеобразовательных учебн. заведений стало значительно возростать с каждым годом, так что к началу войны земские белорусские губернии в школьной деятельности сравнялись с центральными русскими.

Но к сожалению такое быстрое развитие выпало на долю только общеобразовательной школы. Другой тип школ не менее важных, школ технических, был только в зачаточном состоянии, и война совершенно стерла зародыши его. Те немногочисленные технические учебные заведения, какие имелись на Белоруссии, были по большей части эвакуированы в в Россию и застряли там, вероятно, навсегда. Так, по последним сведениям, Виленское техническое училище, находящееся теперь в Казани, соединяется с некоторыми другими специальными учебными заведениями для образования и учреждения политехникума. Очевидно, что в таком случае, Виленское училище, как самостоятельное и белорусское перестает существовать. Такая же участь постигла и некоторые другие учебные заведения, вывезенные из Белоруссии. Между тем, технические учебные заведения, крайне необходимы для нашего края и надлежит не ликвидировать их, а наоборот стремиться к возможно, более широкому развитию их. Белоруссия, находясь среди промышленных и производительных областей, является тем водным и железнодорожным путем, по которому происходил и будет происходить усиленный товарообмен. Поэтому для надлежащей организации транспорта и обслуживания путей необходим довольно значительный технический персонал. Далее, по своим лесным богатствам Белоруссия занимает одно из первых мест в Европейской России, и при правильно поставленной эксплоатации и ведении лесного хозяйства, она смогла бы приносить огромную пользу трудовому населению. Надлежащая же постановка лесного хозяйства требует специалистов по технологии древесных материалов. Кроме того, необходим также ряд промышленных предприятий по изготовлению сельско-хозяйственных орудий, так как Белоруссия по существу является чисто земледельческим краем. Уже одно указание на эти три отрасли в технической промышленности достаточно для того, чтобы признать необходимость в техническом образовании в крае.

Если к этому прибавить условия настоящего и ближайшего будущего времени, условия экономического характера, созданные войною, то каждому станет ясно, насколько важно и необходимо для нас техническое образование. Благодаря войне, на Белоруссии разрушены дороги, мосты; города и села разорены; предметы сельского хозяйства уничтожены. Для восстановления у нас нормальной жизни потребуется много не только труда, но и специальных технических познаний.

Сознавая всю важность и необходимость технического образования в крае, Белорусское Вольно-Экономическое Общество в Петрограде в заседании своем 22 ноября нов. ст. и подняло вопрос об учреждении Белорусского Техникума, как первого рассадника технической науки. На этом заседании постановлено было деятельно работать в направлении осуществления высказанной задачи и поручено нескольким лицам приступить к разработке планов по организации этого высшего установления.

Пожелаем успеха Обществу в его благом начинании и выражаем надежду, что оно с честью выполнит поставленную себе в этом отношении задачу.

И. Н.

Аб усім па троху.

Хроніка Камісарыяту.

Пастановаю калегі Беларускаго Нацыянальнаго Комісарыяту зачынята Смаленская атдзяленьня Б. Н. К. Замест яго [illegible] Самары.

—

Ц. К. камуністычнай партыі бальшавікоу забрау т. Лагуна, управляючаго Бел.-Нац. Камісарыяту ля працы у ачышчануй немцамі Беларусі.

—

Калегія Бел.-Нац. Камісарыяту назначыла памошнікам управляючаго справамі т. З. Чарнушэвіча. Камітэт Маск. Беларускай Сэкцыі Р. К. П. (бальшавікоу) гэта падмацавау і цяпераka т. Чарнушэвіч кіруя справамі Б. Н. К.

—

Культурна-асьветны атдзел Б. Н. К пасылая двух сваіх супрацоунікау на Беларусь ля працы там.

—

Вітэбскі Губіспалком зачыніу Вітабская атдзяленьня Бел. Нац. Камісарыяту. З гэтае прычыны Калегіяй Белкакома і Мас. Бел. Сэкцыяй камуністау быу дэлягаван т. Жылуновіч дзеля перагаворау з Губіспалкомам. З перагаворау вывілася, што Губіспалком гэта зрабіу с пачыну Вітэбскаго Камітэту Р. К. П. бальшавікоу. Т. Жылуновіч настаяу, каб гэта пытаньня Камітэт перагледзяу і павядаміу Белнакоу аб сваіом парашэньні.

—

Маск. Бел. Сэкцыя Камуністау вынясла пратэст супроціу Вітэбскаго Губіспалкома за яго пастанову зачыніць атдзел Белнакома. Петраградцкая Беларуская Сэкцыя Камуністау са свайго боку так сама прыняла пратэст на конт гэтаго.

—

На 28 гэтаго месяцу адбудзяцца канфярэнцыя супрацоунікау выданьняу Белнакома у Маскве, у памяшканні Белкакома.

Беларуская жыцце у Маскве.

— Як і трэба было чакаць, націск самога жыцця змяніу шмат што у тутэйшых беларускіх арганізацыях. Абедзве не-камуніст'кія беларускія палітычныя арганізацыі, як «Белар. Сацыялістычная Грамада» так і «Б. народная грамада» памерлі «сваею смерцю». Лепшыя сілы першае «узарвалі яе знутра», разыйшоушыся с пазыцыяю свайго партыйнаго Ц. К. Другая ж арганізацыя «Народная грамада», утраціушы свайго кіраунікa, п. Цвікевіча, памалу замерла і цяпер сасім не падае ніякаго голасу і ужо больш 3—4 месяцау як ня збіраяцца. Што належыць да прафэсіанальных з'еднаній служачых чугунак і почты целеграфа і целефону, та яны скора будуць ачышчэны ад шкодных камуніст'каму рулу асоб і кіравання хаурусамі возьмуць на сябе шчырыя прыяцелі працоунаго беларускаго народу, а не людзі, якім было калісь ці па дарозе з буржуазеяю.

І канешня такія змены можна толькі прывітаць, бо ужо дауно раздаюцца галасы нездавольства кірауніцтвам гэтых гурткоу.

— Зварочвая на сябе увагу праца апошніх тыдняу у Беларускум навукова—культурнум обчастве. Выбраная яго агульным сходам рэдакцыйна — выдавецкая камісія, у склад якога вайшлі вядомыя вучоныя як праф. Пічэта В. І. і народазнауца Янчук М. А., выпрацавала шырокі плян выдавецтва, з якім вайшла цераз культ.-асветны адзел Белнакома у навуковы адзел Народнаго Камісарыяту Прасветы. Можна спадзявацца, што плян гэты, дэтальна і жыцева-прыкладна распрацованы атрымая патрэбная падтрымання і усе тыя навуковыя і практычныя выдання, шмат маюцца гатовымі у рукапісях, «убачаць скора свет»... Напрыклад маюцца саусім гатовыя навуковыя працы:

1) збор матэр'ялау па народазнауству Беларусі—праца у 40 друкованых аркушау па 16 лістоу у кожным, с рысункамі і нотамі; гэта саусім новыя матэр'ялы з беларускаго народнаго жыцця, звычаяу, музыкі і народнае творчасці, сабраныя апошнімі гадамі і нігдзе ня друкованыя;

2) збор беларускіх народных творчасцей, раней ужо друкованых, але у рожных выпадковых, рэдкіх і заграпічных выданнях, карыстаць якімі раней мала было або заграніцаю, або у Пецярбургу і Маскве толькі; у ем будзя ня менш 25 друкованых аркушау;

3) зборнічак народных беларускіх песянь дзеля школьнаго выкарыстання (карагоды, гульні, пацехі і (інш.);

4) некулька монографічных прац па гісторыі Беларусі пад рэдакцыяю праф. Пічэты;

5) некулькі кніжак па сельскуй гаспадарца у прыкладзя патрэб новых хворм землякарыстання (камуны), інтэнсіфікацыі (моцнаго грунта спользвання) гаспадаркі і новых іншых патрэб сучаснаго момэнту сярод працоунаго селянства і яшчэ некулька іншых падгатаваных да друку рэчай. Як бачым обчаства ідзе насустрэчу новым патрэбам сучаснаго палітычнаго парадку.

— Нарыхтавання двухмесячніка «Беларуская жыцце», выдання Б. навукова-культ. вобчаства, шпарка ідзе наперад і яд рэдакцый мы даведаліся змест № 1. Сярод іншаго матэр'ялу зварочваюць на сябе увагу такія артыкулы: цікавыя нарысы па гісторыя знаўству Літвы і Беларусі (аб кіяускіх вучоных школах Антановіча); нігдзе яшчэ ня друкованыя вершы і пераклады-вершы М. Багдановіча, Цішкі Гартнаго, Я. Купалы і іншых; артыкул аб палітычных напрамках у беларускум нацыянальнум руху с прыкладам дакумэнтау гістарычнаго характэру; народныя песні, сабраныя у Слуцкум павеця яшчэ у 50-х гадох мінулаго веку, атрыманыя з папер вядомаго маскоускаго вучонаго Бадзянскаго; нарысы эканамічнаго жыцця на Беларусі (снурныя і дрэуляныя вырабы) і інш. артыкулы. У першум сшытку будзя некулька фатаграфій, рысункау і будуць прыложаны ноты. Трэба пажадаць толькі адпаго, каб цяжкія цяпер тэхнічныя варункі друкавання ня затрымалі б скарэйшаго выхаду у свет гэтаго журналу. Калі пецярбурхскаму Беларускаму вольна—эканамічнаму вобчаству удасца нарыхтаваць і свой месячнік «Беларусь», мы можам тады мець два навуковых перыядычных выдання, справа, аб якой калісьці мы, беларусы, маглі6 мець толькі адны голыя спадзеі. Так творыцца новая жыцце.

— Можна думаць, што прыезд у Маскву з Мінска лідэра беларускіх эсэрау гр. Грыба стаіць у звязку с тою дэлягаціяю, якую пасылая Мінская Беларуская Рада да савецкаю ураду Расеі і у якую войдзя і чакаямы беларусамі у Маскве Р. Земкевіч. Цікава, як маятнік Рады хістаяцца з боку у бок, та у Берлін, та у Масквау. Дарма стараюцца шукаць выхаду! Наш гаротны народ дауно выказау, куды глядзяць яго вочы са спадзеяю помачы і толькі дзеля палітыканау яшчэ неясна—з народам, чы без яго.

— Першая таварыства драмы і камэдыі у Мінску, атрымаушы матэр'яльную помач на сваю прасветную працу сярод беларускаго народу хоча прыехаць на гастроль у Маскву на Колады. Трупа і хор цяпер маюць што паказаць братньму вялікарасейскаму працоунаму народу. Тэатральны адзел Камісарыяту народн. асветы абяцау т-ву сваю помач дзеля гэтаго прыезду у Масвву. Белнаком ад сябе зробя што зможа.

Н. Б—і.

ках на сцяне, ня відаць было Нухрэю. Крыку дзяцей на дварэ ен, здаецца, зусім ня чуу і ня прыкмеціу, як мінула, так каля трох гадзін часу, за які Луцэя сумела збегаць на рынак і вярнуцца назад.

Застаушы мужа тупаючым, яна здзіуляна запытала:

— Ты усе с таго часу тупаяш?

— З якога?

— А як пашоу Змітро?

— Ці ж доуга ужо?

— Гадзін со тры: я з рынку вярнулася.

— Ну?

— Але.

— Ня помню... Надта дрэнна мне... Што ты нарабіла? га? Я як і чуу, ня хацеу іці, а ты усе наставала... Усе праз цябе гэты надазолы... Ах, дурніца я!..

— Кінь ты, чаго ужо вельмі так...

— Будзя табе чаго!.. пачакай... вось пачуяш, што запяюць...

Нухрэй прысеу. Луцея пашла к печы. З надворку разам у дваіх убеглі у хату двоя дзетак-хлопчыкау.

— Дайця есці, мамачка!—у адзін голас папрасілі яны.

— Зараз, дзеткі,—суцешыла іх Луцэя:—вось будзям палуднуваць ужо. Садзіся і ты, Нухрей, да паеш чаго, а то яшчэ нашча, нябось.

Нухрэй пашоу к мыцяльніку і памыу рукі; потым вярнууся к сталу і, ня наспеу яшчэ прысесьці, як у хату раптам увайшоу Фомка Лыш.

— Здраступця!—суха праказау ен—я знарок да цябе, Нухрэй.

— А што?

— А вось: наш камітэт меу аб табе раду і толькі што пастанавіу нядазволіць табе працаваць ні у годнаго гаспадара. Каторы гаспадар асьмеліцца цябе прыняць на работу—ня будзя сам мець ні работы, ні рабочых. І гэта за твае штрайбрэхарства і змену. Вось тут гэта пастанова,—падаючы паперачку, цьвіорда с прыціскам праказау ен, завярнууся і вышау.

Паперкі Нухрэй ня мог узяць з яго рук: дрыготка сполаху затрасла яго, як вецяр асіну. Як сядзеу, так і асунууся ен на стол.

Луцэя замерла на мейсту з вілкамі у руках.

У хаця запанавала на момант маркотная ціша, ажно чууся бзынк мух і трапункам заблудзіўшае васы.

— Тата, тата, — ня сьпеця! Будзям есці!—патурхау бацьку Янка.

Сцепка ж адвярнууся к вакну і зорыу на яблынку у гародчыку.

— Загостра, браткі так! Нухрэй жанаты, сямейны! Дзеці есці просяць і ен іх бараніу ад смерці... чууся гучны гоман на дварэ, спусціушы крыху часу. Луцэю ен раскатурхау, Нухрэй жа бязмоуна ляжау на стале...

Падыходзіу адвячорак.

Цішка Гартны.

З Беларусі.

У Літоуску́й Тарыбя.

Літоуская Тарыба перарабляцца у прапарлямэнт. У яе увайшлі беларусы і жыды. Палякі часова ня ваходзяць. У краю ідзе арганізацыя міліцыі і назначэньня паветавых начальнікау, пры гэтым у Беларускія паветы назначаюцца толькі беларусы. На гэтых днёх складаецца асаблівая дэлегацыя Тарыбы у Лондан; дэлегацыя—з літоуцау, беларусау і жыдоу. Беларусская правіцельства у Літоускуй Тарыбя займая самая лівая крыло.

Пры міністэрству па Беларускім справам закладаяцца Беларускі дэпартамэнт. Начальнікамі паветау: Бельскаго, Беластоцкаго, Сакольскаго, Гродзенскаго, Ваўкавыскаго, Слонімскаго, Пружанскаго, Кобрынскаго, Лідскаго і іншых будуць назначаны видомыя беларускія дзеячы.

Мініцяр па Беларускім справам у Ліцьве.

28 наябра вярнууся з Вільні, што выкліканы туды па тэлеграфу, І. Я. Варонка. Мэта выклічкі—назначэньня І. Я. Варонкі міністрам па Беларускім справам Літоускаго гасударства. Пан Варонка праз два дні меу параду са старшым Рады міністрау, прахвесарам А. Вольдэмарам па гэтаму пытаньню. Прапанову Літоускаго ураду п. Варонка атрымау. Цяпер на чарзе стаіць пытаньня аб выхадзя яго з гуртка міністрау у Беларусі.

К перадатку упрауленьня Мінскае губэрні.

Камісія па атрыманьню упрауленьня Мінскаю губэрняю ад акупацыйнаа уласьці складзяна з восьмі якіх асобау. У гурток Камісіі выбраны: ад губэрскага земства—Н. К. Ярашэвіч, К. М. Дземідзецкі—Дзэмідовіч і Е. К. Прокаповіч, ад гораду—С. Ф. Кавалік і А. И. Вайнштэйн.

Адозва Беларускае Рады.

Праз некульні дзён выпушчаюцца [illegible] адозвы Рады Беларускае Народнае Рэспублікі і Рады Народных Міністрау. [illegible] будучае дзейнасці Рады Народных Міністрау.

Ат'езд гэнярала Кандратовіча

Гэнярал К. А. Кандратовіч нераехау у Вільню дзеля атрыманьня упрауленьням і хварміраваньням злучаными беларускалітоускімі вайскавымі часткамі.

(Мінскі голас).

Пасылка дэлегацыі у Расею.

У стасунку с прапановаю члена гарацкое управы І. В. Тэуміна, гарацкая управа парашыла паслаць да правіцельства Савецкае Расеі прадстаунііка забраць лаугі належачыя гораду па харчовым справам і квартараваньню расейскіх вайскоу і ведаць сьвядомасці аб можнасці атрыманьня задачкі.

К ат'езду папоуства.

Апрыч архіепіскапа Георгія маяцца быць у звязку с палітычным палажэньнем ат'езд з Мінску на Украіну някаторых ведомых прадстаунікау духавенства, у тым ліку і настаяцаля кахведральнаго сабору Пауската.

Голас беларусау аб Радзя.

(Рэзалюцыя Заслаускае патрабіцальнае Грамады).

У цяперашнія часы Беларуская Рада, карыстаючыся падтрыманням нямецкае уласьці, пражацца усіо больш выдаваць сябе за належнага прадстауніка народау Беларусі.

Мы прауленьня і члены Заслаускаго Вобчаства Патрабіцэлау, лічучы, што:

1) Рада Беларуская нікім ня выбрана і ня упаунамочана гаварыць ад усіх народау Беларусі;

2) Рада многімі дзеямі, як далучэньня у свой гурток папоу і ксяндзоу з карыстаньням апошнім фактычнае больш як пасылка вернападданае тэлеграмы у Бэрлін і інш. сусім адлучыла сябе ад працоучаго народу Беларусі,

3) Чарговаю задачаю моманту з'яуляецца стваральня краевое уласьці з [illegible]

ПАСТАНАВІЛІ:

1) Спрачаямся супроць захапляньня Радаю правоу народау Беларусі;

2) Адцураямся падтрымоуваць яе і

3) Трэбуям няадкладнага зладжэньня краявога цэнтру, які прадстауляу бы інтарэсы працоуных аграмадау Беларусі.

Члены прауленьня: А. Маурын, І Каспэровіч, Д. Мурзіч, Ѳ. І. Івінскі, І. Бізюк, (Подпіс) Равізіонная камісія: М. Вайтовіч, (Подпісь) Члены Заслаускаго Вобчаства «Единеніе» І. Г. Метліцкі, С. Івінскі, Е. В. Гапановіч, І Яніцкі, Пав. Хапецкі (Подпісь) З пастаяшчым верна:

Старшы Прауленьня Заслаускага Вобчаства патрабіцелау «Единеніе» Д. Мурзіч, сакратар А. Маурын.

(Дело Труда).

Прывітання гэрманскуй равалюцыі ад Беларускай Рады.

У палове наябра месяца гэтаго году Беларуская Рада паслала цялаграмму да Берлінскай Рады Работніцкіх Дэпутатау з прывітаннам гэрманскуй равалюцыі. У цялаграмма выказана надзея, што нямецкі народ сам толькі што высвабадзіушыся с-пад уціску, паможа і беларускаму народу абараніць сваю нязалежнасьць.

Дэлегацыя Беларускай Рады у Яссы.

На апошняй свайой сэссіі, скончыушайся у канцы наября месяца, Беларуская Рада пастанавіла паслаць дэлегацыю у Яссы, гдзе адбываецца цяпер канфэрэнцыя хаурусных дзяржау. Дэлегацыі даручала прадставіць хаурусьнікам мэмарандум аб гістарычнум развіцьці беларускай дзяржаунасьці разам с картаю этнаграфічных межау беларускаго народу і дабівацца ад хаурусных дзяржау прызнаньня яе нязалежнасьці

За рубяжом.

К раздробу Гэрмані. «Кіольнская Народная газэта» абурвая павядамленьня «Форвэртс» аб тым, што рэйнскія правінцыі хочуць аддзяліцца ад Гэрмані. [illegible] «Форвэртс» усіо ж вамагая [illegible] у Стразбургя, па пачатку хранцузскаго [illegible] вырахоувалася пытаньня аб аддзяленьні незалежнае рэспублікі з паудзіонных праві цыяу Гэрмані. Аб гэтым Шэйдэман піша, што віна за магчымы раздроб Гэрмані падзе на спартакаунцау. Каб спалохаць народ бальшавізмам і утлумачыць яму, што ратунак толькі у шайдаманаунцах, іон самаю чорнаю ахварбоуваю рысуя палажэньня, якоя зрабілася ад бальшавізму у Расеі.

Гэрманія плаціць кантрыбуцыю. Як паведамляя «Дэмен», Сагласьсям былі паслапы Гэрмані восьякія трэбаваньня аб пакрыцьці патратау: 1) Праз некулькі гадоу пакрыцьцю патратау павінна расьціцца грашмі. У асообу павінны быць заплачаны усе патраты, зробляныя Бельгіі і Хранцыі. Гэтыя апошнія вырахоуваюцца у два с паловаю мілія ды хунтау стэрлінгау; 2) усе зніштожаныя у Бельгіі і Хранцыі гарады павінны быць зноу узбудованы нямецкімі рабочымі. Матар'ялы дзеля будоулі павінны даставяцца нямецкімі рабочымі; 3) павінна быць дадзяна узмяшчэньня за згубляныя караблі; павінна быць зробляна згода між хаурусьнікамі і цантровымі дзяржавамі, каб усе нямецкія караблі працавалі на патрэбу усіх, або-ж каб на нямецкіх верфях (майстэрні карабельныя) былі зробляны новыя караблі дзеля ангіліцкаго і іншых гандліовых хлотау; 4) апрыч пакрыцьця патратау Бельгіі і Хранцыі павінны быць вернуты і другія патраты; 5) усіо золата, якоя іосць у Гэрмані, павінна быць выдана хаурусьнікам; 6) На працягу некулькіх гадоу бярэцца падатак вугальлям, а здабытак апошняга кантралюяцца хаурусьнікамі; 7) убыткі Італі, Сербі і Чарнагоры так сама павінны быць вернуты.

Гэрманія перадала расейская золата Хранцыі. Статс-сакратар Эрцбергер выпусціу ад каміс і перамі ра восьякоя заяуленьня: «Шмат якіх сьвядомых газэтау змясціілі вестку аб тым, быццам, супроць 19 ст. згоды аб пераміры, у стасунку з якою атрыманыя ад Расеі і Румыніі грошы Гэрманія павінна перадаць дзяржавам Сагласься, імпэрскі банк, па трэбаваньню сучаснаго ураду, перадау 240 мільёнау марак ня дзяржавам Сагласься, але бальшавіцкаму ураду у Маскве. Усамдзеля ж падмацоуваяцца, што імпэрскі банк ня перадау бальшавіцкаму ураду ні [illegible] золата, [illegible] 93.536 [illegible] золатам, [illegible] 336 мільёнау марак ад Хранцыю.

Пасылка знайходзіцца у дарозя на Парыж.

Распад Вэнгры. Начальнік хаурусная міссіі па выпаупеньню варункау пераміра у Вэнгры, палкоунік Вікс, патрэбавау ад вэнгерскаго першага міністра Каролы няадкладнага уводу вэнгерскіх вайскоу з славацкіх зямель Вэнгры. Каролы заявіу, што іон прымушаны пакарацца гэтаму трэбаваньню, але спрачаяцца супроць такога тлумачэньня варункау пераміра. У адозвя да народу вэнгерскі урад заяуляя, што, знайходзючыся у сціснутум палажэньні, пакараяцца трэбаваньням хаурусьнікау, але тым часам ня адцураяцца ад прыналежачых Вэнгры правоу і правазглашая, што вэнгерскі народ паставіць супроць гвалтоу'я свая права самавіта парашыць свой ліос.

Аб'еднаньня Сербі с Краацыяй і Славоніяй. Прынц Аляксандра Сербскі заявіу пасланцом паудзіонна-славянскае нацыянальнае рады, што ня у даліокія часы мая быць аб'еднаньня Сербі с Краацыяй і Славоніяй у едзіная каралеуства.

Пляны чэха-славакау. Моцныя чэхаславацкія атрады рухаюцца на Нікольсбург. Чэхі заяуляуць, што яны хочуць захапіць у сваі рукі чугункі, вядучыя у Вэнгру, каб злучыцца з маючымися там хранцузскімі вайскамі.

Далучэньня да Румынії новых зямель. Нацыяльная румынская рада апавясціла маніхвэст, правазгалашаюшчы далучэньня румынскіх зямель Трансільвані і Вэнгры да Румыні.

«Анархія у Гэрмані, парадак у Расеі». З Парыжу б'юць па тэлятрафу: газэта «Эхо-де-Пари» у стацьці аб палажэньні у Гэрмані адчыняна заяуляя, што дзеля Сагласься выгадна бязпрыпынная пашырэньня у Гэрмані анархіі, якая вавядзе яе да распаду. Газэта лічыць, аднака патрэбным замацаваньня парадку у Расеі і у Астрыі.

Перамовы «важных» расейцау с Сагласьсям. Бывшы расейскі прэм'ер князь Львов і п. Бахмецьеу, расейскі посла у Злучаных Штатах, і іншыя «вялікія» асобы *пакінулі Нью-Іорк і нарыхтаваліся ва Хранцыю*, каб быць на парадзя расейскіх кыпламатау у Парыжы з мэтаю высьвятліць пытаньня аб расейскум прадстаунітвя на будучай канфэрэнцыі аб замірэньні.

У Расеі.

Панскі прыгон.

Газэта «Новая Рада» павядамляя, што па усей Херсоншчыня паны сыскваюць падаткі з селян за псоту маіонткау і сельска-гаспадарскаго начыньня. Хто адцураяцца плаціць, таго вешаюць. (Роста)

У Дзвінску.

9 дзекабра а 5½ гадзіня вечару галауною ротаю забрата ст. Дзвінск. Вакзал і чугунковыя пуці, а так сама і мост перад Дзвіну—спрауныя. На мосця пастаулена наша варта. (Роста).

Слуцак забраны.

8 дзекабра намі заняты горад і станыя Слуцак. Народ сустру нашы вайскі і прыіомачную камісію з радасьцю. Немцамі у Слуцку пакінуты адзін цягнік і пяць вагонау. (Роста).

Дрэнная палажэньня ворага.

З перахопляных тэлеграмау працунінка відаць, што у вакрузя Пауночнага Капказу працунік знайходзіцца у поунум страсунку. Сілы яго падзеляны на асобныя атрады і мечуцца з боку у бок.

Далейшы рух нашых вайскоу.

Пры забраньні Іеуве намі захопляны куляміоты, пленныя і хурманкі белагвардзейцау. Ад Іеуве нашы часткі крануліся на паутары вярсты пауночна-заходняй Іеуве, пауз ідучай ад яго шыаы да Цырпсалю на 10 віорст, а пауз берагу да Валгаста. (Роста).

Дзеяльнасць петлюрауцау.

Камандуюшчы пятлюраускімі вайскамі у Чарнігаушчыня Палій паслау немцам, якія знайходзяцца у Канатопя і яго вакрузя, ультыматум аб выданьні варужжа.

Бойки на вуліцах.

На вуліцах Палтавы ідуць бойкі між пятлюраунцамі ахвотнікамі — ахвіцэрамі.

Хаваюць прауду.

Вайскі Пятлюры, спаткаючыся з народам, завуць сябе «равалюцыйнымі вайскамі», «абараніцелі працоунага народу», праву «пятлюраунцы» яны лічаць дзеля сябе ганьбоваю. (Роста).

Разалюцыі.

Выписки из протоколов Общего Собрания Петроградской Белорусской Секции коммунистов 3-го декабря и заседания Бюро Петроградской Секции коммунистов 4-го декабря.

Заслушав доклад тов. Д. Жилуновича, присланного Белорусской Секцией Р. К. П. (большевиков), о постановлении последней созвать в ближайшее время С'езд представителей Белорусских Секций Р. К. П. (большевиков), Общее Собрание Петроградской Белорусской Секции коммунистов признает крайне необходимым созыв такового С'езда и передает инициативу созыва последнего Московской Белорусской Секции Р. К. П. (большевиков). при этом Петр. Белорусская Секция коммунистов высказывает пожелания: 1) чтобы С'езд был созван в Москве, как центре политической жизни, 2) чтобы на С'езде были представители из освобожденной и еще занятой Белоруссии и 3) чтобы о С'езде была дана широкая реклама путем опубликования во всей Советской прессе. Представительство на С'езд желательно установить по следующему модусу: Секция с числом членов от 5 до 10 человек посылает одного представителя, от 10 до 20—2 представителей, от 20 до 50—3 представителей. от 50 до 75—4 представителей, от 75 до 100 чел. и выш—5 представителей.

О дне созыва уведомить Петр. Белорусскую Секцию коммунистов телеграфом несколькими днями раньше.

Резолюция Петроградской Белорусской Секции большевиков, принятая Общим Собранием 3-го декабря 1918 года.

Общее Собрание Петроградской Белорусской Секции при Петроградском Комитете Р. К. П. (большевиков) находит неправильным действие Витебского Губисполкома, выразившееся в закрытии Витебского Отделения Белорусского Национального Комиссариата без переговоров и согласия на это Белорусского Национального Комиссариата и Наркомнаца, и видит в этом вторжение Губ'исполкома в дела Центральной Власти, вносящее разлад и дискредитирование систематики ея революционного творчества в деле разрешения национального вопроса с Советской точки зрения.

Общее Собрание Секции протестует против постановления Витебского Губ'исполкома и настаивает на отмене последнего.

Председатель Общего Собрания **Завадко.**

Секретарь **Устилович.**

Редактор и Издатель:

Редакционная Коллегия.

[illegible]